6 (203)
чэрвень
Выдаецца
са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

*Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1221 ад 14 студзеня 2013 г.*

Выходзіць 12 разоў у год (з ліпеня 2003 г.)

НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Пачатковая школа", дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

**Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч**

**Рэдакцыйная калегія:**

**Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

**Рэдакцыйная рада:**

**Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан (старшыня рады), Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Аляксандр Корзюк, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.**

**Рэдакцыя:**

Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактар аддзела — **Надзея Кушнер**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Людміла Шчэрба**.

## ЗМЕСТ

Слова ад рэдакцыі — 3

ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ

Юрый Бохан — Адлюстраванне Грунвальдскай бітвы 1410 г. у "Хроніцы" Мацея Стрыйкоўскага — 4

ДЗЯРЖАВА І ПРАВА

Ірына Кітурка — Справа Іахіма Кліковіча, суперінтэнданта Юрбаргскай сплаўной каморы, як адлюстраванне праблем у арганізацыі мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст. — 11

ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

Сяргей Новікаў — Баявыя дзеянні Чырвонай арміі летам 1941 года: дасягненні і перспектывы найноўшай гістарыяграфіі і крыніцазнаўства — 18

## ЗМЕСТ


ІМЁНЫ ВЯДОМЫЯ І НЕВЯДОМЫЯ

Вольга Долатава, Юлія Матусевіч — Дарога ў бессмяротнасць: жыццёвы подзвіг Героя Савецкага Саюза Яўгена Уладзіміравіча Клумава — 28

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Анатоль Вялікі — "Забвению не подлежит" — 35

МЕТОДЫКА. ВОПЫТ

Вячаслаў Лазіцкі — Электронны адукацыйны рэсурс па гісторыі Беларусі як сродак арганізацыі навучання ў 6 класе — 39

Ольга Кравченко — Тематические картографические задания по истории Беларуси *(VI класс)* — 44

Сергей Жук — Примеры заданий для подготовки к участию в олимпиадах по истории учащихся 5—9-х классов — 51

Вольга Буката, Таццяна Суркант — Выкарыстанне сучасных форм арганізацыі краязнаўчай работы *(на прыкладзе дзейнасці школьнага аб'яднання "Спадчына" СШ № 1 г. Ліда)* — 62

Галіна Грыжмаловіч — Музей "Народны побыт Беларусі" — асяродак матэрыяльнай культуры беларусаў — 73

Содержание — 79

Summary — 80


*У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2005 г. № 101 (у рэдакцыі загада Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 2 лютага 2011 г. № 26) "Беларускі гістарычны часопіс" уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных і юрыдычных навуках, а таксама па мастацтвазнаўстве і культуралогіі.*


Адрас рэдакцыі: 220007, г. Мінск,
вул. Фабрыцыуса, 5, кабінет 211.
Тэлефон: 8(017)395-79-11. http://www.p-shkola.by;
e-mail: bhc.redaktor@tut.by.
РУП "Выдавецтва "Пачатковая школа".
Падпісана да друку 22.06.2016 г.
Выхад у свет 29.06.2016 г. Афсетны друк.
Фармат 60x84 1/8.
Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11,4.
Наклад 600 асобнікаў. Зак. 3586.
*Надрукавана ва ўнітарным паліграфічным прадпрыемстве "Віцебская абласная друкарня". ЛП № 02330/116 ад 27.03.2014 г. 210015, г. Віцебск, вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4.*


***Да ведама аўтараў!***
***За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш за 20 старонак (кегль 14, праз 1,5 інтэрвала) у двух экзэмплярах (абавязкова на электронных носьбітах). Неабходна ў допісах паведамляць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова асабісты нумар), адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.***


© "Беларускі гістарычны часопіс", 2016.

Вячаслаў ЛАЗІЦКІ

# Электронны адукацыйны рэсурс па гісторыі Беларусі
## як сродак арганізацыі навучання ў 6 класе

*Адпаведна з палажэннямі Канцэпцыі інфарматызацыі сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г. (зацверджаная ў 2013 г.) і праграмай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь "Электронныя адукацыйныя рэсурсы" метадыстамі Нацыянальнага інстытута адукацыі, навукоўцамі і настаўнікамі распрацоўваюцца электронныя адукацыйныя рэсурсы (ЭАР), мадэлі і методыкі іх эфектыўнага выкарыстання па гісторыі Беларусі, усеагульнай гісторыі і грамадазнаўстве. У артыкуле апісваецца структура электроннага адукацыйнага рэсурса "Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст." і некаторыя яго дыдактычныя матэрыялы, што змешчаны па электронным адрасе http://e-vedy.adу.by*

Названы электронны адукацыйны рэсурс утрымлівае сістэматызаваныя ў модулі матэрыялы праграмна-метадычнага, даведачна-інфармацыйнага, кантрольна-дыягнастычнага і інтэрактыўнага, атрактыўнага характару. Модульнасць дазволіла вырашыць праблему "доўгажыхарства" ЭАР ва ўмовах змянення структуры і зместу школьнай гістарычнай адукацыі. Зразумела, што ў адпаведнасці з палажэннямі вучэбнага плана і вучэбнай праграмы па гісторыі Беларусі для 6 класа на 2016/2017 навучальны год спатрэбілася пэўная аптымізацыя зместавага напаўнення модуляў.

З 2016/2017 навучальнага года гісторыя Беларусі будзе вывучацца са старажытных часоў да канца XV ст. З гэтага года шасцікласнікі будуць засвойваць значны па аб'ёме праграмны матэрыял па наступных тэмах: "Беларускія землі ў старажытныя часы", "Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі ў IX — сярэдзіне XIII ст.", "Беларускія землі ў перыяд узнікнення і ўмацавання ВКЛ", "Беларускія землі ў складзе ВКЛ у канцы XIV — XV ст.". Нагадаем, што пры планаванні арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў настаўніку неабходна ўлічваць:



***ЛАЗІЦКІ Вячаслаў Лявонцьевіч.***

*Дацэнт кафедры гуманітарных навук, філасофіі і права Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1963 г. у г. Пінск. У 1989 г. закончыў гістарычны факультэт БДУ. З 1989 г. па 2009 г. працаваў настаўнікам гісторыі СШ № 1 Пінска. Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. У 2009 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Выкарыстанне электронных сродкаў навучання падчас вывучэння гісторыі Беларусі на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі". Займаецца даследаваннем укаранення інфармацыйных педагагічных тэхналогій у працэс навучання. Аўтар больш за 50 навуковых публікацый, у тым ліку манаграфій "Научно-методические основы создания и применения электронных средств обучения по дисциплинам социально-гуманитарного цикла (на примере истории)" (Мн., 2009), "Электронный учебно-методический комплекс по дисциплинам социально-гуманитарного цикла. Научно-методические основы создания и системного применения" (Мн., 2012); "Информационная компетентность как основа системного применения информационно-коммуникационных технологий в высшем образовании (на примере преподавания социально-гуманитарных дисциплин" (Пинск, 2013).*

— спецыфіку, месца і ролю вывучаемага гістарычнага матэрыялу ў сістэме школьных гістарычных ведаў (з 6 класа вучні пачынаюць сістэмнае вывучэнне гісторыі Беларусі на падзейна-храналагічным узроўні);

— адукацыйны патэнцыял гісторыі (выхаванне ў вучняў грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці праз фарміраванне гістарычнай памяці і нацыянальнай ідэнтычнасці, выпрацоўка гістарычнага мыслення, навыкаў прагназавання, усведамленне гістарычнай адказнасці за ўласную дзейнасць);

— узроставыя псіхолага-фізіялагічныя асаблівасці арганізацыі і ажыццяўлення пазнавальнай дзейнасці вучняў, іх кагнітыўныя (пазнавальныя) магчымасці;

— дыдактычную мэтазгоднасць сістэмнага прымянення традыцыйных і электронных сродкаў навучання на розных этапах арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў — уроку, пры правядзенні факультатыўных заняткаў, у пазакласнай рабоце па гісторыі, у час самастойнай падрыхтоўкі вучняў.

Згодна з палажэннямі вучэбнай праграмы, вучні павінны засвоіць шматкампанентны склад гістарычных ведаў і фарміраваць наступныя спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і ўмець:

— суадносіць дату са стагоддзем, вызначаць паслядоўнасць і працягласць гістарычных падзей, суадносіць падзеі з пэўным гістарычным перыядам;

— чытаць легенду вучэбнай гістарычнай карты, лакалізоўваць гістарычныя аб'екты і падзеі на карце;

— рыхтаваць кароткія паведамленні аб гістарычных падзеях і іх удзельніках, выступаць з імі;

— ажыццяўляць з дапамогай настаўніка параўнанне гістарычных фактаў з мэтай выяўлення агульнага і асаблівага, рабіць на падставе параўнання высновы;

— тлумачыць з дапамогай настаўніка прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі;

— атрымліваць з дапамогай настаўніка неабходную інфармацыю з нескладаных гістарычных крыніц;

— складаць аповед па вучэбнай ілюстрацыі і працаваць з ёю;

— характарызаваць умовы жыцця насельніцтва Беларусі.

Дыдактычная роля ЭАР заключаецца ў эфектыўным метадычным і інструментальным забеспячэнні працэсу арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў пры засваенні імі шматкампанентнага складу вучэбных гістарычных ведаў і спосабаў дзейнасці. Пераход з 2015/2016 навучальнага года ад лінейнага да канцэнтрычнага прынцыпу арганізацыі школьнай гістарычнай адукацыі абумоўлівае неабходнасць абавязкова-га ўліку зместавых і структурных змяненняў вучэбнай праграмы.

Электронны адукацыйны рэсурс па гісторыі Беларусі "Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст." (6 клас) (Moodle [Электронный ресурс] // История Беларуси. История Беларуси с древних времен до окончания XV в. VI класс. — Режим доступа: http://e-vedy.adu.by) распрацавалі кандыдаты педагагічных навук В.Лазіцкі, А.Корзюк, кандыдат гістарычных навук А.Філімонаў. Структура ЭАР па гісторыі Беларусі падзелена на наступныя складнікі-модулі (раздзелы): нарматыўна-метадычны, даведачна-інфармацыйны, кантрольна-дыягнастычны, інтэрактыўны. Іх змястоўнае напаўненне ўлічвае прадметную спецыфіку гісторыі Беларусі, дыдактычную накіраванасць і функцыянальную неабходнасць кожнай з модульных адзінак.

**Нарматыўна-метадычны модуль** змяшчае наступную дакументацыю:

— вучэбную праграму па вучэбным прадмеце "Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст." для VI класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання;

— метадычныя рэкамендацыі для настаўнікаў па выкарыстанні ЭАР па гісторыі Беларусі ў 6 класе для арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроку, факультатыўным занятку, у пазакласнай рабоце па прадмеце, у час самападрыхтоўкі вучня па гісторыі Беларусі з прымяненнем ЭАР;

— метадычныя рэкамендацыі для настаўнікаў па выкарыстанні кожнага з модуляў ЭАР;

— тэхналагічную карту для канструявання сістэмы вучэбных заняткаў з выкарыстаннем модуляў ЭАР у сукупнасці з традыцыйнымі кампанентамі;

— памяткі-рэкамендацыі вучням па фарміраванні ўменняў і навыкаў эфектыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці пры вывучэнні гісторыі Беларусі.

**Даведачна-інфармацыйны модуль** змяшчае дыдактычныя модульныя адзінкі арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроках падчас вырашэння пазнавальных вучэбных задач і факультатыўных занятках — тэрміны і паняцці, храналагічныя звесткі, факты, падзеі, назвы гісторыка-геаграфічных аб'ектаў, гістарычныя персаналіі. Важнай асаблівасцю тэхналагічнага афармлення кожнага з модульных кампанентаў з'яўляецца аб'яднанне школьнага гістарычнага матэрыялу праз гіперспасылкі, якія дазваляюць аператыўна ажыццяўляць пошук неабходнай інфармацыі пры арганізацыі праблемна-пошукавай дзейнасці вучняў, падчас іх самастойнай падрых-

тоўкі. Намі вызначаны наступныя кампаненты даведачна-інфармацыйнага модуля ЭАР па гісторыі Беларусі:

— *электронны тэзаурус* дапамагае настаўніку выкарыстоўваць структураваныя адпаведна тэмам вучэбнай праграмы тэрміны і паняцці, фактычны матэрыял. Напрыклад, у тэмах раздзелаў III "Беларускія землі ў перыяд узнікнення і ўмацавання ВКЛ (сярэдзіна XIII — канец XIV ст.)" і IV "Беларускія землі ў складзе ВКЛ у канцы XIV—XV ст." паняцце "прывілей" з'яўляецца абавязковым для засваення яго вучнямі, і з дапамогай гіперспасылкі ЭАР можна прачытаць яго азначэнне, пабачыць прывілей вялікага князя Аляксандра Казіміравіча Полацку аб праве на самакіраванне. У тэзаурусе прыведзеныя звесткі пра гістарычных асоб, змешчаныя па храналогіі гістарычныя даты і адпаведныя падзеі. Выдзеленыя ў тэзаурусе назвы гісторыка-геаграфічных аб'ектаў арыентаваныя на выкарыстанне як інтэрактыўных карт ЭАР, так і традыцыйнага сродку навучання — атласа па гісторыі Беларусі;

— *электронны слоўнік-гласарый* змяшчае тэарэтычны і фактычны матэрыял па гісторыі — азначэнні гістарычных тэрмінаў і паняццяў і адпаведны ілюстрацыйны матэрыял;

— *даведнік па гістарычнай храналогіі* ў таблічнай форме змяшчае храналогію гісторыі Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст.;

— *электронны даведнік па гістарычных персаналіях* змяшчае партрэтныя выявы і характарыстыкі гістарычных дзеячаў. Напрыклад, пра вялікага князя літоўскага Кейстута прыводзяцца наступныя звесткі.



*(?— 1382). Сын Гедыміна, вялікі князь літоўскі. З 1345 г. падзяляў з братам Альгердам вярхоўную ўладу ў Вялікім Княстве Літоўскім. Дапамагаў яму ў пашырэнні межаў на ўсход і поўдзень. Аберагаў заходнія межы краіны ад агрэсіі Тэўтонскага ордэна. У 1381 г. адлучыў ад улады вялікага князя Ягайлу. У 1382 г. задушаны па загадзе Ягайлы ў Крэўскім замку.*

**Кантрольна-дыягнастычны модуль ЭАР** змяшчае комплексы рознаўзроўневых тэставых заданняў, задачы і заданні па храналогіі Беларусі (чатыры варыянты па кожным раздзеле і два варыянты для абагульнення па ўсім вучэбным курсе). Яны дазваляюць ажыццяўляць дыягностыку і кантроль вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў згодна з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта і вучэбнай праграмы. Пры стварэнні дыягнастычнага інструментарыя (рознаўзроўневых тэставых заданняў і комплексаў) аўтарамі ўлічаны ўзровень засваення зместу вучэбнага гістарычнага матэрыялу і адпаведная дзесяцібальная сістэма ацэньвання. Выходзячы з дыдактычнай мэтазгоднасці, тэсты магчыма выкарыстоўваць на этапах сістэматызацыі, замацавання і карэкцыі ведаў, на ўроку абагульнення і факультатыўных занятках. Пошукавы сервіс і гіперспасылкі ЭАР дазваляюць звярнуцца да гістарычнай інфармацыі даведачнага характару. Прывядзем прыклады тэстаў розных варыянтаў па раздзеле "Беларускія землі ў старажытныя часы і Раннім сярэдневякоўі".

1. У гісторыі Беларусі пераход старажытных людзей да земляробства і жывёлагадоўлі адбыўся:

Выберыце адзін адказ:

a) у сярэдневякоўі; b) на рубяжы каменнага і бронзавага вякоў; c) у канцы бронзавага века; d) у жалезным веку.

2. Суаднясіце верна элементы мностваў:

1) родавая абшчына;

2) праабшчына;

3) суседская абшчына;

4) племя.

А) калектыў кроўных родзічаў, якія вялі сумесную гаспадарку і супольна валодалі прыладамі працы;

Б) назва найстаражытнага адносна ўстойлівага калектыву людзей, якія займаліся збіральніцтвам;

В) калектыў старажытных людзей, што пражывалі асобнымі сем'ямі і займаліся пераважна сельскай гаспадаркай;

Г) устойлівае аб'яднанне некалькіх родаў агульнага паходжання.

3. Вызначыце правільную паслядоўнасць вынаходніцтва прылад працы старажытным чалавекам (напрыклад — АБВГ): А) барана-сукаватка; Б) палка-капалка; В) матыка; Г) драўляная саха (рала) з жалезным сошнікам.

4. Вызначыце правільна гістарычны тэрмін, паняцце (напрыклад, БРОНЗА).

Прадмет імпарту ў бронзавым веку, які трапляў на тэрыторыю Беларусі з паўднёвага ўзбярэжжа Балтыкі, — гэта ... ц.

*(Адказы. 1. b. 2. 1А. 2Б. 3В. 4Г. 3. БВАГ. 4. Бурштын.)*

У кантрольна-дыягнастычным і інтэрактыўным модулях утрымліваюцца задачы і заданні па храналогіі гісторыі Беларусі. Атрактыўная і пазнавальная форма работы будзе спрыяць трываламу засваенню вучнямі шматкампанентнага складу гістарычных ведаў і спосабаў вучэбнай дзейнасці. Задачы і заданні, для выканання якіх патрабуюць выкарыстаць дадатковы матэрыял, пазначаныя ў модулі зорачкай (*). Прывядзем прыклады аднаго з заданняў.

* Гісторыкам вядомыя знаходкі жаночых упрыгажэнняў — сярэбранага бранзалета і сяміпрамянёвага скроневага кальца ў пасяленні славян каля вёскі Хотамель Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Прадстаўніцам якога з усходнеславянскіх плямёнаў, што сяліліся на тэрыторыі Беларусі, яны належалі? У які перыяд сярэдневякоўя (згодна з гістарычнай перыядызацыяй) адбылося фарміраванне гэтага племяннога аб'яднання? *(Адказ. Сяміпрамянёвыя кольцы насілі радзімічанкі. Яго фарміраванне прыпадае на Ранняе сярэднявякоўе.)*

**Інтэрактыўны модуль ЭАР** змяшчае кампаненты інтэрактыўнага і атрактыўнага характару, якія мэтазгодна выкарыстоўваць для вырашэння задач навучання і выхавання ў працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў 6 класе. Пералічым іх тэхналагічныя і дыдактычныя магчымасці.

*Морфінг-трансфармацыя "Гістарычныя персаналіі ў гісторыі Беларусі"* знаёміць вучняў з вывамі гістарычных дзеячаў з дапамогай анімацыі і музычнага суправаджэння. Для яе стварэння выкарыстаны выданні: Гістарычныя асобы Беларусі: вучэбны дапаможнік для 5—8 класаў: [камплект рэпрадукцый] / іл. Варэца Л.А., Варэца В.І. ; тэкст: Слесарава І.М., Лойка П.А., Бохан Ю.М. (Мн., 1995); Культурныя дзеячы Беларусі: вучэбны дапаможнік для 5—8 класаў [камплект рэпрадукцый] / іл. Варэца Л.А., Варэца В.І.; тэкст: Слесарава І.М., Лойка П.А., Бохан Ю.М. (Мн., 1995). У ёй прадстаўлены дзеячы гісторыі і культуры Беларусі XI—XVIII стст. (прыводзіцца ў паслядоўнасці, у якой змешчаны ў ЭАР): Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Усяслаў Чарадзей, Міндоўг, Давыд Гарадзенскі, Гедымін, Альгерд, Кейстут, Вітаўт, Ягайла, Казімір Ягайлавіч, Аляксандр Казіміравіч, Жыгімонт І Стары, Канстанцін Астрожскі, Францыск Скарына, Мікола Гусоўскі, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Пётр Мсціславец, Жыгімонт ІІ Аўгуст, Барбара Радзівіл, Юрый Радзівіл, Мікалай Радзівіл Чорны, Стэфан Баторый, Еўстафій Валовіч, Леў Сапега, Андрэй Рымша, Лаўрэнцій Зізаній, Афанасій Філіповіч, Мялецій Сматрыцкі, Ілья Капіевіч, Казімір Семяновіч, Казімір Лышчынскі, Іосіф Руцкой, Сімяон Полацкі, Міхал Клеафас Агінскі, Тадэвуш Касцюшка. Атрактыўнасць кампанента інтэрактыўнага модуля ЭАР дазваляе рэалізаваць прынцып пераемнасці пры вывучэнні культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа ў кантэксце агульнаеўрапейскіх і сусветных каштоўнасцяў.

Морфінг-трансфармацыі прапануем прымяняць наступным чынам:

а) на ўводным уроку з мэтай актуалізацыі і абуджэння цікавасці вучняў да гісторыі Беларусі;

б) пры вывучэнні перыяду сярэдневяковай гісторыі Беларусі (раздзелы II—IV вучэбнага дапаможніка);

в) на ўроку выніковага абагульнення як элемент падагульнення і паказу пераемнасці пры вывучэнні гісторыі ў 7 класе;

г) на пазакласным мерапрыемстве па гісторыі Беларусі.

**Храналініі па гісторыі Беларусі** як кампаненты інтэрактыўнага модуля ў якасці дыдактычных сродкаў аб'ядноўваюць тэарэтычны і фактагічны (у тым ліку храналагічны і картаграфічны), ілюстрацыйны матэрыялы па тэмах вучэбнай праграмы ў 6 класе. Канструяванне і прымяненне храналіній ажыццяўляецца з дапамогай ужытковай праграмы "ОСЗ Хронолайнер 1.0." (гл. метадычныя рэкамендацыі, змешчаныя ў нарматыўна-метадычным модуле ЭАР ці на сайце http://school-collection.edu.ru/catalog/rubr/dae17bc7-b523-aefe-da26-413558f8b554/103199/).

Прывядзем прыклад храналініі па тэме "Беларускія землі ў першай палове XIII ст. Барацьба са знешняй пагрозай". На экране ўнізе змешчана стужка часу, на якой умоўнымі абазначэннямі пазначаны гады нападу на беларускія землі крыжакоў і манголаў. У цэнтры экрана ў спецыяльным акне прадстаўлены вывы воінаў-захопнікаў, воінаў-абаронцаў, прыводзяцца апісанні ваенных сутыкненняў і бітваў. Такія храналініі дазваляюць у сістэматызаваным выглядзе паказаць хроніку падзей і іх удзельнікаў, замацаваць і абагуліць вучэбны матэрыял, вучням — ажыццяўляць рэфлексію вучэбных дасягненняў.

**Інтэрактыўныя карты** па гісторыі Беларусі ў 6 класе як кампаненты ЭАР з'яўляюцца дыдактычнымі сродкамі, у якіх вучэбная інфармацыя прадстаўлена ў аніміраванай форме. Гэта такія карты, як "Засяленне старажытнымі людзьмі тэрыторыі Беларусі", "Славянскія саюзы плямёнаў на тэрыторыі Беларусі", "Вялікае Княства Літоўскае ў другой палове XIII — XIV ст.", "Знешнепалітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў сярэдзіне XIII — першай трэці XV ст.". Прыводзім прыклад інтэрактыўнай карты "Славянскія саюзы плямёнаў на тэрыторыі Беларусі" *(гл. с. 43)*.




*Інтэрактыўная карта*
*"Славянскія саюзы плямёнаў на тэрыторыі Беларусі".*

У якасці характэрных асаблівасцяў прымянення інтэрактыўных гістарычных карт як кампанента высокатэхналагічнага сродку навучання ЭАР па гісторыі Беларусі ў 6 класе вызначаюцца:

— атрактыўнасць формы прадстаўлення вучням вучэбнага гістарычнага матэрыялу праз анімацыю, садзейнічае рэалізацыі прынцыпу нагляднасці;

— шматканальнасць успрымання вучнямі гістарычнай інфармацыі ў статычнай і дынамічнай, вербальнай і невербальнай формах;

— магчымасць адлюстравання падзей старажытнай гісторыі Беларусі ў дынаміцы (у гістарычным часе і гістарычнай прасторы);

— забеспячэнне хуткага ўзаемадзеяння вучняў з электронным сродкам навучання;

— развіццё з дапамогай дынамічнай картаграфічнай анімацыі спецыяльных гістарычных уменняў па рэканструкцыі і інтэрпрэтацыі гістарычных падзей і працэсаў.

Вывучэнне гістарычных падзей і ўменне лакалізаваць іх у межах гісторыка-геаграфічнай прасторы разам з фактамі, датамі і гістарычнымі асобамі садзейнічае фарміраванню і развіццю ўменняў не толькі сістэматызаваць засвоенныя гістарычныя веды, але і аб'ектыўна асэнсоўваць іх, аналізаваць і ацэньваць падзеі, працэсы і з'явы гістарычнага мінулага Бацькаўшчыны. Дадзены аспект абавязкова павінен улічвацца настаўнікам гісторыі пры мадэляванні вучэбнага занятку ў межах праектавання зместу навучання.

Змешчаныя ў якасці кампанента модуля дадатковыя тэматычныя заданні інтэрактыўнага характару па гісторыі Беларусі ўяўляюць сабой: заданні на размяшчэнне гістарычных падзей на стужцы часу; заданні на веданне дзейнасці гістарычных персаналій; заданні на запаўненне пропускаў у гістарычным тэксце; заданні на пошук памылак у гістарычным тэксце; заданні на суаднясенне выяў вялікіх князёў літоўскіх з часам іх кіравання. Праверка правільнасці выканання заданняў і магчымасць неабходнай карэкцыі прадугледжаны ў дадзеным кампаненце інтэрактыўнага модуля. Прывядзем прыклад аднаго з заданняў па тэме.

*Задание.* Уважліва прачытайце гістарычны тэкст і выдзеліце памылкі, пстрыкнуўшы па іх левай клавішай мышы. Жадаю поспеху!

У 1323 г. Альгерд перанёс сталіцу дзяржавы ў Трокі. Узросшая роля кіраўніка дзяржавы яскрава бачна ў змене яго тытула. Альгерд пачаў называць сябе каралём Літвы і Польшчы. Таму дзяржаве стала называцца Вялікае Княства Літоўскае і Польскае. Пазней, калі да яго была далучана Аўкштайція, яно стала называцца Вялікае Княства Літоўскае, Польскае і Аўкштайцкае. Але часцей за ўсё ўжывалася Вялікае Каралеўства Літоўскае.

Аўтары ЭАР па гісторыі Беларусі ў 6 класе не ставілі мэту мадэлявання гатовых распрацовак урокаў ці факультатыўных заняткаў з прымяненнем сродкаў ІКТ. На наш погляд, выкарыстанне дыдактычных элементаў модуляў ЭАР дазваляе настаўніку гісторыі стварыць індывідуальную мадэль вучэбнага занятку. Спалучэнне традыцыйных сродкаў навучання —вучэбнага дапаможніка, хрэстаматыі, рабочага сшытка па гісторыі Беларусі на друкаванай аснове, гістарычнага атласа са сродкамі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (у тым ліку і кампаненты ЭАР) — з'яўляецца больш эфектыўным з-за іх тэхналагічнага і дыдактычнага патэнцыялу. Абсалютызацыя ролі сродкаў ІКТ у якасці выключнай "дыдактычнай панацэі" з'яўляецца памылковай. Дзякуючы сваім якасцям ЭАР па гісторыі Беларусі дазваляе эфектыўна кіраваць вучэбна-пазнавальнай дзейнасцю вучняў на ўроку, факультатыўных занятках, у час самападрыхтоўкі вучняў. Метадычныя матэрыялы электроннага рэсурса будуць карысныя для настаўнікаў гісторыі пры падрыхтоўцы да тэматычных выступленняў на педагагічных нарадах, пасяджэннях метадычных аб'яднанняў, для прафесійнага самаўдасканалення.